# Вобраз Еўфрасінні Полацкай у літаратуры, мастацтве, скульптуры, музыцы

Урок беларускай літаратуры ў 6 класе

**А. Ф. Станкевіч,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры СШ 12 г. Оршы

У кожнага народа ёсць свае гістарычныя асобы, якія з’яўляюцца сімваламі роднай зямлі. З імем Еўфрасінні Полацкай асацыіруецца не толькі духоўнае жыццё на ўсходнеславянскіх землях у XII ст., але і ўся шматвяковая гісторыя Беларусі. Складаны і незвычайны лёс беларускай патронкі натхніў на творчасць многіх літаратараў, мастакоў, кампазітараў і скульптараў.

Задача настаўніка беларускай літаратуры не толькі пазнаёміць вучняў з гістарычнай асобай і паказаць на прыкладах, якім чынам ушаноўваецца ўдзячнымі нашчадкамі яе імя, але і даць вучням уяўленне пра літаратуру, як чалавеказнаўства і мастацкае слова.

Прапанаваная распрацоўка ўяўляе сабой канспект урока па беларускай літаратуры ў VI класе.

Тэма ўрока: “Еўфрасіння Полацкая”: вобраз нябеснай заступніцы Беларусі ў літаратуры, мастацтве, скульптуры, музыцы” (2-і ўрок па тэме). Гэта ўрок камбінаванай будовы, які праводзіўся ў форме даследчай лабараторыі.

**Мэты:**

1) знаёмства вучняў з мастацкім увасабленнем Еўфрасінні ў творах літаратуры, мастацтве, музыцы;

2) стварэнне ўмоў для разумення вучнямі таго, што святая Еўфрасіння стаіць у ліку самых яркіх асоб Сярэднявечча, асэнсавання велічы постаці асветніцы, яе ролі ў беларускай гісторыі і культуры;

3) стварэнне сітуацый, якія садзейнічаюць выхаванню ў вучняў любві і павагі да гісторыі роднага краю, пачуцця гонару за сваіх славутых суайчыннікаў.

**Тып урока:** урок камбінаванай будовы.

**Форма правядзення:** даследчая лабараторыя.

**Абсталяванне:** прэзентацыя “Еўфрасіння Полацкая ў літаратуры, мастацтве, скульптуры, музыцы”; табліца “Мае веды”; табліца “Вобраз беларускай патронкі”; выстава кніг, прысвечаных нябеснай заступніцы Беларусі.

## Ход урока

**I. Арганізацыйны момант.**

Прывітанне. Паведамленне тэмы ўрока.

**II. Праверка дамашняга задання. Мэтавызначэнне.**

1. Запаўненне табліцы “Мае веды”. Вызначэнне мэт урока.

| Патрабаванні к ведам | Ведаю (+) | Хачу даведацца (?) |
|---|---|---|
| 1. Перакажыце змест твора С. Тарасава “Еўфрасіння Полацкая”. | | |
| 2. Перакажыце змест дакументальнага фільма “Еўфрасіння Полацкая”. | | |
| 3. Параўнайце гістарычныя звесткі пра Еўфрасінню Полацкую з твора С. Тарасава “Еўфрасіння Полацкая” са звесткамі дакументальнага фільма “Еўфрасіння Полацкая”. | | |
| 4. Раскрыйце вобраз Еўфрасінні Полацкай у<br>літаратуры;<br>мастацтве;<br>скульптуры;<br>музыцы. | | |

2. Агучванне вучнямі мэт да ўрока.
3. Прагляд дакументальнага фільма “Еўфрасіння Полацкая”.
4. Параўнанне гістарычных звестак пра Еўфрасінню Полацкую з твора С. Тарасава “Еўфрасіння Полацкая” са звесткамі дакументальнага фільма “Еўфрасіння Полацкая”.

**III. Работа ў даследчай лабараторыі.**

1.Уступнае слова настаўніка:

- Мэта нашага ўрока – вызначыць ролю мастацкага ўвасаблення вобраза Еўфрасінні Полацкай.

- На працягу ўрока вы будзеце абараняць свае даследчыя праекты, якія падрыхтавалі дома. Галоўныя думкі выступлення кожнай групы вы павінны занатаваць у табліцы:

| | |
|---|---|
| “Вобраз Еўфрасінні Полацкай у літаратуры” | |
| | |
| | |
| “Вобраз Еўфрасінні Полацкай у мастацтве” | |
| | |
| | |
| “Вобраз Еўфрасінні Полацкай у скульптуры” | |
| | |
| | |
| “Вобраз Еўфрасінні Полацкай у | |
| | |

| | |
|---|---|
| музыцы” | |

2. Выступленні даследчых груп.

**1 група. “Вобраз Еўфрасінні Полацкай у літаратуры”.**
***Вучань 1.***

Самы значны ўплыў духоўнай справы Еўфрасінні зазнала літаратура. Жывое славянскае слова, над распаўсюджваннем якога так шчыравала наша зямлячка, прарасло яе імем у літаратурных творах XX ст.

Яркі вобраз той, якая "для ўсіх была ўсім", пасля доўгай афіцыйнай забароны (у Парыжы, Кліўлендзе, Лондане пра яе друкавалася болыш, чым на радзіме) зноў заззяў сваёю веліччу на крывіцкай зямлі.

Праца з матэрыяламі пра Еўфрасінню, наведванне яе радзімы выклікалі ў мяне глыбокае эмацыянальнае ўзрушэнне. Таму не дзіўна, што паэты і празаікі дружна адгукнуліся на вяртанне святога імя сваімі творамі. Да апошняга часу вершы, аповесці і апавяданні былі рассыпаны па шматлікіх перыядычных выданнях. У 1998 г. у серыі "Бацькаўшчына" выйшаў зборнік пад назвай "Кніга Прадславы", дзе ўкладальнікам С. Панізнікам сабраны найбольш значныя і цікавыя мастацкія і публіцыстычныя творы, прысвечаныя нашай зямлячцы. Зборнік пачынаецца "Калядным пасланнем Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта" з нагоды надзвычайнай падзеі — вяртання на беларускую зямлю "Крыжа прападобнае маці нашае Еўфрасінні, ігуменні Полацкай".

Прадмова да "Кнігі Прадславы" належыць укладальніку і прысвечана ўстанаўленню гістарычнай справядлівасці — вяртанню слаўнага імя полацкай князёўны Прадславы.

Матэрыял у зборніку размеркаваны паводле жанравай прыналежнасці па трох раздзелах:

1. "Пуцяводная зорка" (проза і драматургія);
2. "Малюся я небу зямлі і прастору..." (паэзія);
3. "Не пакіну вас..." (публіцыстыка).

***Вучань 2***.

- Вобраз жанчыны-падзвіжніцы кожны з аўтараў, чые працы змешчаны ў зборніку, бачыць па-свойму.

Таіса Бондар (раман "Спакуса") уяўляе сваю гераіню мужнай і нязломнай у дасягненні высокіх мэтаў з *"палкім, бясспграшным позіркам "*. У яе Еўфрасінні жывуць рашучасць і нязгасны бунтоўны агонь: *"...сілу ў сабе чую большую, чымсьці жанчыне мецъ дазволена, і ўсю сілу гэту я богаўгодным справам аддаю, на карысць люду полацкаму і ў славу яго..."* — кажа маладая Еўфрасіння. Твор

Т. Бондар — гімн чалавечай мэтанакіраванасці, альтруізму і адданасці справе.

Для Вольгі Іпатавай (аповесць "Прадыслава") найбольш важным з'яўляецца раскрыццё на фоне вялікіх падзей асабістага, інтымнага свету жанчыны, якая прынесла ў ахвяру сваім перакананням усе маладыя сілы, прыгажосць і плён рэдкага розуму. Аповесць напоўнена псіхалагічнымі дэталямі і ўнутранымі маналогамі, побытавымі замалёўкамі і сімвалічнымі

асацыяцыямі. Так, калі ў згаданым творы Т. Бондар храм Спаса набывае значэнне маўклівага помніка неўміручым справам Еўфрасінні, то ў В. Іпатавай ён — хутчэй духоўнае спараджэнне дойліда Іаана і ігуменні. У "Прадыславе", насычанай жывымі мастацкімі падрабязнасцямі, вобразнымі, выразнымі сцэнамі, высвечваецца сапраўдная сутнасць і значнасць духоўнай ахвяры галоўнай гераіні.

У творах, названых вышэй, за аснову ўзяты сюжэт "Жыція...". Алег Лойка ў рамане-эсэ "Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае" вылучае на першы план не так жыццёвы шлях полацкай князёўны, як яе значнасць для сталення наступных пакаленняў. Вобраз асветніцы ў свядомасці юнага Францішка зліваецца з вобразам яго маці, што вядзе чытача да больш шырокага абагульнення: ігумення-кніжніца з'яўляецца не толькі промнем вучонасці для хлопчыка, але і духоўнаю маці Скарынавага (значыць, і ўсходнеславянскага) кнігадруку.

Прыклад святой прывядзе Францішка да адданага служэння "людем посполітым".

Апавяданне Сяргея Тарасава "Фрэскі" яднае з творам Вольгі Іпатавай тое, што падзвіжніцтва Еўфрасінні паказваецца на фоне асабістых перажыванняў галоўных герояў. Як і ў эпізодзе з дзяўчынкай Прадыславай (з аповесці В. Іпатавай),якая разам з маці просіць ратунку ў манастыры, у творы празаіка побач з ігуменняй — дзеці, іх незамутнёнае, чыстае ўспрыманне людзей і свету. Іх вачам адкрываецца сутнасць, існасць душы асветніцы, яе прыхаваная пяшчота і цеплыня ў адносінах да малых як нечага няспраўджанага ў жыцці. Для чытача так і застаецца загадкай, што менавіта *"ніяк не клалася на словы... трымцела, штурхала малечае сэрца, ірвалася вон-кі",* калі на хлопчыка Андрэйку зірнула з фрэскі святая. Ці гэта была сіла мастацтва, ці лунаў у паветры боль страчаных надзей, ці такое ўражанне стваралі дзівосныя вочы Еўфрасінні?

***Вучань 3.***

- Раздзел паэзіі пачынаецца артыкулам У. Гніламёдава "Традыцыі Прадславы ў беларускай паэзіі", у якім аўтар разглядае вершы "Дума на Полацкім замчышчы" В. Ластоўскага, "Сафійскі сабор" А. Мінкіна, "Ефрасіння Полацкая" Л. Геніюш, "Ефрасіння. XII ст." Л. Тарасюк, "Сутнасць" В. Зуёнка, "Беларускія жанчыны" А. Звонака, "Ефрасіння Полацкая" Д. Бічэль-Загнетавай, "І была там вясна" Н. Арсенневай, "Мальба" Р. Барадуліна. Імкненне пранікнуць у патаемны свет героя вядзе да раскрыцця ўласнага светабачання творцы. Не сакрэт, што ў кожнага аўтара, як і ў кожнага чалавека, сваё, часам унікальнае, непаўторнае ўспрыманне навакольнага. Але ўсё ж такі, калі чытаеш паэзію, адчуваеш, "мужчынская" яна ці "жаночая". Паэзія, адметная лагічным, інтэлектуальным пачаткам, звычайна належыць мужчынам і апявае ў асноўным славу і здзяйсненні, патрыятызм і падзвіжніцтва палачанкі, як, напрыклад, верш "Фрэскі" Валянціна Лукшы:

*Ускрыліла над зямлёю Ефрасіння*
*Асветніцай,*
*Пакутніцай,*
*Святой.*

Рэфрэнам гучыць сцвярджэнне неўміручасці справы ігуменні ў творы Алега Лойкі "Ефрасіння Полацкая":

*Мір табе, Ефрасіння!..*

*Посах твой не прыстане...* .

У вершы "Апошняя малітва Ефрасінні Полацкай" Васіля Зуёнка на першы план таксама выступае палымяны патрыятызм лірычнай гераіні:

*...Я лячу да цябе, Радзіма,*

*Са святога Ерусаліма....*

Міхась Кавыль у творы "Божа наш" семантычна збліжае вобразы маці

і Радзімы:*"Каб з душой святое Ефрасінні Выйшла ў людзі Маці-Беларусь!"*

Такім чынам, з паэтычных твораў перад намі паўстае асветніца, падзвіжніца, духоўная маці нашай зямлі, непакорная дачка і мужная жанчына з нялёгкім, але незвычайным і слаўным лёсам.

***Вучань 4.***

- Публіцыстычныя творы, змешчаныя ў зборніку, заслугоўваюць асаблівай увагі з той прычыны, што даюць разнастайны, багаты матэрыял пра жыццё і дзейнасць Еўфрасінні і яе сучаснікаў**.**

Найбольш грунтоўнае даследаванне "Нібы прамень сонечны" належыць пяру Уладзіміра Арлова — яно змяшчае дакументы, успаміны, спасылкі, каштоўныя развагі аўтара-гісторыка і адначасова вызначаецца выразным публіцыстычным пафасам. Аналагічны паводле матэрыялу ўступны артыкул "Ефрасіння Полацкая" Ірыны Багдановіч.

Багаты звесткамі па гісторыі Беларусі і суседніх краін нарыс "Не пакіну вас..." Ганны Запартыкі. Непасрэднымі жывымі ўражаннямі напоўнены нататкі "Беларусь - зямля святая" Валянціны Шымановіч і "Паломніцтва ў Полацак — гэта шлях да вытокаў, шлях да саміх сябе" Івана Ждановіча. Праблеме сувязі дзейнасці Еўфрасінні Полацкай і жаночага руху на Беларусі прысвечана эсэ Валянціны Коўтун "Нацыянальнальная святыня". Набліжаны да апавядання публіцыстычны твор Аляксандра Кудрашова "...Кожнага памілуй і ад бяды пазбаў". Дзецям адрасаваны нарыс Алеся Марціновіча "Ефрасіння Полацкая ".

**Група 2. "Вобраз Еўфрасінні Полацкай у мастацтве".**

***Вучань1.***

- Вобраз Еўфрасінні Полацкай – адзін з самых любімых у беларускіх мастакоў.

А. Кашкурэвіч, С. Лагуновіч-Чарапко, А. Марачкін, П. Свентакоўскі, Я. Кулік, Н. Шчасная, І. Васюк, В. Васняцоў…Гэта няпоўны пералік мастакоў, якія ў сваёй творчасці звярталіся да вобраза Патронкі Праваслаўнай Беларусі.

Карціна Кашкурэвіча "Еўфрасіння Полацкая-асветніца" была напісана ў 1992 г.

Кантраст чорнага і белага ў гэтай карціне ўзмацняе драматызм . Вялікая эмацыянальная душэўная сіла бачыцца ў постаці Еўфрасінні Полацкай. Выразныя, строгія лініі перадаюць гэту сілу. Наш погляд затрымліваецца на яе вялікіх, глыбокіх вачах. Быццам яна скрозь стагоддзі глядзіць на сваіх нашчадкаў, трымаючы ў руках крыж і кнігу, тое, чаму яна прысвяціла ўсё сваё жыццё.

***Вучань2.***

– Усім нам вядома карціна Лагуновіча-Чарапко “Еўфрасіння Полацкая”.

На гэтай карціне Еўфрасіння напісана ў прыгожа прыбраным памяшканні.Уяўляецца, што яна нядаўна скончыла перапісваць кнігу і вырашыла адпачыць. Яе яшчэ малады твар звернуты да гледача. На стале знаходзіцца ўсё, што ёй неабходна для работы: кнігі, аркушы паперы, скручаныя ў трубачку, чарніліца з пяром, малітвеннік. З акна відна Спаса-Праабражэнскую царкву. Скрозь невялікія акенцы ў памяшканне льецца сонечнае святло. Мастак паказаў прыгожае ўбранне, посуд, кветкі. Толькі постаць Еўфрасінні Полацкай стрыманая, строгая. Погляд яе вялізных, бяздонных вачэй гаворыць пра вялікую духоўную сілу, рашучасць і ў той жа час яны свецяцца любоўю і дабрынёй.

***Вучань3.***

- Вельмі незвычайнае стварэнне вобраза Еўфрасінні на карціне А.Марачкіна “Еўфрасіння Полацкая”. Мастаку ўдалося надзвычай дакладна асэнсаваць гістарычны матэрыял і стварыць па-сапраўднаму адухоўлены вобраз старажытнай палачанкі, княжацкай дачкі, асветніцы, ігуменні. Удалае бакавое верхняе асвятленне ствараецца за кошт светлавых яркіх блікаў і залацістага водсвету карціны. Гэта ў значнай меры дапамагло старанна выпісаць знешні выгляд Еўфрасінні Полацкай, зрабіць яго асветленым. Кантрастнасць фарбаў верхняй і ніжняй частак карціны надае ўсяму партрэту строгасць і ўрачыстасць.

Перад намі постаць жанчыны, якая глыбока адчувае свой час, разумее сэнс свайго жыцця. Твар яе надзвычай засяроджаны, задуменны, але неспакойны. Ён быццам выпраменьвае багаты жыццёвы вопыт і мудрую прастату. Уважлівы погляд глыбакадумных, крыху сумных вачэй, якія глядзяць удалячынь, быццам скрозь час і прастору, выдае ў ёй патрыётку сваёй Бацькаўшчыны, моцную воляй, рашучую ў сваім імкненні служыць людзям, быць гатовай да жыццёвых выпрабаванняў. Агульны настрой ад карціны ўзмацняецца шэрагам дэталяў. За спіной Еўфрасінні ўзвышаецца царква, якая дапамагае нам адчуць, што гэтая асветніца-ігумення прыйшла сёння да нас адтуль, з далёкага мінулага, прыйшла, каб паспавядацца перад намі. Залацісты колер яе адзення дапамагае перадаць яе душэўную заспакоенасць, стрыманасць, надае ўсяму яе знешняму абліччу нейкую ўрачыстасць і таямнічасць. На прыгожым твары ляжыць адзнака заклапочанасці, нейкай празмернай засяроджанасці. Еўфрасіння паказана на фоне прыроды. Злева і справа каля яе ног – папаратнік, у руках, магчыма, папараць-кветка, якая прыносіць людзям шчасце. Левая рука прыкладзена да грудзей, быццам святая хоча пераканаць нас у сваім вялікім жаданні служыць людзям. Ва ўсім яе знешнім абліччы – мудры спакой і сапраўдная чалавечая годнасць, тая годнасць, якую не купіш ні за які матэрыяльны дабрабыт. Перад намі партрэт звычайнай жанчыны, манахіні, у якой натхнёны задумленны твар. Такой убачыў Еўфрасінню Полацкую Свентахоўскі – аўтар карціны ”Еўфрасіння Полацкая”.

**Група 3. “Вобраз Еўфрасінні Полацкай у скульптуры”.**

***Вучань1.***

- У гонар беларускай патронкі ўзведзены помнікі ў Полацку і Мінску.

У Мінску ўзведзены два помнікі славутай асветніцы. Адзін знаходзіцца на праспекце Незалежнасці, а другі – у дворыку БДУ.

28 верасня 2000 года ў Полацку быў узведзены помнік Еўфрасінні Полацкай. На конкурсе праектаў помніка перамагла работа скульптара Івана Голубева, члена Саюза мастакоў Беларусі. Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт адобрыў гэты праект і падтрымаў яго. Ва ўзвядзенні помніка прымалі ўдзел усе палачане, ён быў пабудаваны на народныя сродкі.

**Група 4. “Вобраз Еўфрасінні ў музыцы”.**

***Вучань1.***

- Памяць вялікай князёўны, ігуменні, выдатнай асветніцы ўшанавана не толькі ў літаратуры і мастацтве, але і ў музыцы.

Вобраз яе раскрыты як у сімфанічнай музыцы, так і ў эстраднай.

Так А. Ю. Мдзівані, лаўрэат дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, прафесар Беларускай акадэміі музыкі, адну з сямі сваіх сімфоній “Полацкія пісьмяны”, якія былі напісаны да 1125-годдзя Полацка, прысвяціў вобразам Е. Полацкай, Ф. Скарыне, С. Полацкаму. Сімфонія складаецца з дзвюх частак. Першая частка называецца “Лікі”, складаецца з 5 тэм, другая з іх прысвечана Еўфрасінне Полацкай. (праслухоўванне ўрыўка).

***Вучань 2.***

- Эстрадныя песні, прысвечаныя Ефрасінні Полацкай, былі напісаны на словы С. Панізніка, У. Пецюкевіча, П. Дранько-Майсюка, А. Шкуратава.

Апошняя эстрадная песня на музыку і словы А. Шкуратава “Прысвячэнне Еўфрасінні Полацкай” упершыню ў гісторыі айчыннай музыкі была благаслаўлена Мітрапалітам Мінскім і Слуцкім, Патрыяршым экзархам усея Беларусі Філарэтам. Першае выкананне Анжалікай Агурбаш “Еўфрасінні” адбылося на Дні беларускага пісьменства ў Полацку. (праслухоўванне ўрыўка).

**IV. Падагульненне.**

- Ёсць у багатым мінулым Бацькаўшчыны падзеі і асобы, без якіх проста немагчыма ўявіць нашу гісторыю.

Па словах патрыярха, “ гісторыя царквы – гэта гісторыя яе святасці, гэта гісторыя яе святых, падзвіжнікаў, якія заззялі на зямлі Белай Русі”.

Вобраз Святой Еўфрасінні Полацкай натхняў і будзе натхняць дзеячаў мастацтва і літаратуры Беларусі на стварэнне новых цудоўных твораў.

Трэба адзначыць, што памяць вялікай асветніцы ўшанавана не толькі ў літаратуры і мастацтве, а і ў назвах вуліц беларускіх гарадоў. Яе імя носіць бібліятэка ў Віцебску. З’явілася і манета, прысвечаная Еўфрасінні Полацкай.

У 1984 годзе Еўфрасіння была прылічана да Сабора Беларускіх Святых. Дзень памяці Еўфрасінні Полацкай адзначаецца 5 чэрвеня.

*Світальную ратункавую ніць*
*Ніколі нас пакінуць не прымусяць…*

*Жыла, жыве і вечна будзе жыць*
*Патронка Праваслаўнай Беларусі!*

**V. Дамашняе заданне**. Падрыхтаваць вусны аповед пра Еўфрасінню Полацкую.

**VI. Рэфлексія.** "Тэхналагічнае распакаванне ўрока". (Рэфлексія праводзіцца з апорай на табліцу "Вобраз Еўфрасінні…")

## Літаратура


1. **Аповесць жыцця і смерці Еўфрасінні Полацкай** // Старажытная беларуская літаратура (12 - 17 стст.) / уклад., прадм., камент. І.Саверчанкі. – Мінск: Беларус. Кнігазбор, 2007. – С. 69 – 87.
2. **Арлоў, У. А.** Еўфрасіння Полацкая / У. А. Арлоў. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 220с.
3. **Бондар, Т. М.** Спакуса: раман / Т. М. Бондар. – Мінск, 1989.
4. **Іпатава, В. М.** Прадслава: аповесці і апавяданні / В.М. Іпатава. – Мінск, 1997.
5. **Коўтун, В. М.** Пакліканыя: раман / В. М. Коўтун. – Мінск : Полымя, 2002.
6. **Марціновіч, А. А.** Святая Еўфрасіння: нарыс /А. А. Марціновіч. – Мінск, 2001.
7. **Тарасаў, С.** Фрэскі : абразкі і апавяданні / С. Тарасаў. – Мінск, 2004.

ЖОЎТЫ КРЫЖ І НЯБЁСЫ СІНІЯ.
СНЯЦЬ АБЛОКІ СВОЙ БЕЛЫ СОН.
ЗНОЎ З ВЯЛЕБНАЮ ЕЎФРАСІННЯЮ
РАЗМАЎЛЯЕ САМОТНЫ ЗВОН.

БОМ – ПЛЫВЕ І СЦІХАЕ Ў ДАЛЕЧЫ.
БОМ – ЛЯЦІЦЬ ДЗВІНЕ
НАЎЗДАГОН.
ПОЛАЦК СЛАВЯЧЫ, БОГА
ХВАЛЯЧЫ,
ЕЎФРАСІННЮ ВІТАЕ ЗВОН.

М.СКОБЛА

# “… Ззяе святлом праз цемру вякоў святое імя Еўфрасінні”

Еўфрасіння Полацкая і яе вобраз у беларускай літаратуры, мастацтве, музыцы

ВЯКІ,
НІБЫ ТУМАН НАДДЗВІНСКІ СІНІ,
СПЛЫЛІ ЗА ПЕРАКАТЫ НА СПАКОЙ…
УСКРЫЛІЛА НАД ЗЯМЛЁЮ ЕФРАСІННЯ
АСВЕТНІЦАЙ,
ЗАСТУПНІЦАЙ,
СВЯТОЙ.

В. ЛУКАШ

# ЧАСТКА 1.
# ВОБРАЗ ЕФРАСІННІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

*Гады дазволаў межы абкасілі.*
*Падумаць пра духоўнасць самы час…*
*І фрэскі прападобнай Ефрасінні*
*Зірнулі праз імжу вякоў на нас.*

*В. Лукаш*


Бацькаўшчына
Зборнік
гістарычнай
літаратуры







# ЧАСТКА 2
## ***ВОБРАЗ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ У БЕЛАРУСКІМ МАСТАЦТВЕ***

*Пахла воскам у прыцемку сінім.*
*І здавалася: з дна тайнікоў*
*Свецяць вочы Вялікай Княгіні...*
*Гэта здань твая, Ефрасіння,*
*Мільганула з глыбінь вякоў!*

*А. Звонак*



Евфросиния Полоцкая - просветительница.
Литография А.Кашкуревича



Евфросиния Полоцкая.
Картина С. Лагуновича-Черепко



А. Марочкин. Евфросиния Полоцкая. 1986 г.



*П. Свентаховский. Евфросиния Полоцкая. 1991 г.*

# Вобраз Ефрасінні ў скульптуры



Помнік Еўфрасінні ў Мінску



Помнік Еўфрасінні Полацкай у Мінску
на праспекце Ф.Скарыны



Помнік Еўфрасінні
ў Полацку

# РАЗДЗЕЛ 3

# ***Вобраз ЕЎфрасінні ў музыцы***

# А. Ю. МДЗІВАНІ

**СІМФОНІЯ**

***“ПОЛАЦКІЯ ПІСЬМЯНЫ”,***

**ЧАСТКА 1, ДРУГАЯ ТЭМА**

***“ПРЫСВЯЧЭННЕ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ”***

# ПЕСНЯ НА МУЗ. І СЛ. АЛ. ШКУРАТАВА

***"ПРЫСВЯЧЭННЕ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ"***


РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ
2001
АДЗІН РУБЕЛЬ

# Дзень памяці Еўфрасінні Полацкай адзначаецца 5 чэрвеня.

У 1984 годзе

Еўфрасіння была прылічана

да Сабора Беларускіх Святых.

# Рэфлексія “Смайлік”

☺



☹